Тыднёвік Магілёўскі

№ 6 (37)

27.03.98

Магілёў, 22 сакавіка. 80-годдзе БНР

У мінулую нядзелю дэмакратычная магілёўская грамадскасць адзначыла 80-я ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі.



Усё было як звычайна ў Магілёве на працягу апошніх гадоў. Ісці да месца мітынга можна – але арганізаванае шэсце забаронена. Мітынг дазволены – але не ў горадзе, а на ўскраіну, каля Дома культуры завода штучнага валакна. Міліцыянтаў і "агентаў у цывільным", а цяпер яшчэ і актывістаў БПСМ, на мерапрыемстве і побач з ім значна больш, чым людзей ...

Магчыма, што такую сітуацыю нашая мясцовая ўлада, а ад яе за мітынгам назіраў выканкамавец С. Шарснёў, расцэньвае як сваю перамогу, якой можна пахваліцца перад кіруючым краінай "земляком".

(Між іншым тав. Шарснёў, гэты чыноўнік клясычнага наменклятурнага выгляду, які не сароміцца вальяжна працягваць некаторым са знаёмых дэмакратаў руку для вітання, ужо столькі часу прысутнічае на адкрытых мерапрыемствах апазыцыі, што мог бы ўжо стаяць, як гаворыцца, па іншы бок барыкады. Але ён, як і ўся сённяшняя ўлада, мае нейкім чынам выпеставаны ці дараваны яму ад прыроды імунітэт да таго, што называецца нармальнасцю, прыстойнасцю і свядомасцю. Усё ж сам бачыць і чуе штогод, а сэрца і розум настолькі зачыненыя, што не вачам і вушам сваім верыць, а ідэалагічным "бацькавым" заклінанням аб хуліганах і экстрэмістах ... Ды не, не верыць ён хутчэй за ўсё ні ў ва што. Гэта пакуль побач з ім надзейная амонаўская ахова, а ў кішэні чыноўніцкі дабрабыт, – ён з імі. А пераверне́цца, як спяваецца ў песні, прастора – і ён пачне зазіраць у вочы новым уладарам, а тое і нагадваць ім пра свой пастаянны ўдзел "у мерапрыемствах").

Вярнуся аднак да пачатай вышэй думкі. Суды, штрафы, амонаўскія дубінкі, выключэнні студэнтаў і звальненні службоўцаў, пабытовыя жыццёвыя цяжкасці (пры такім кіраўніцтве краінай у каго іх няма!), грамадская апатыя і нявер'е людзей у самых сябе, прэзыдэнцкі папулізм і адміністратыўная нахабнасць улады, размытасць сілаў апазыцыі, забарона праўды аб беларускай гісторыі, амаль адкрытая забарона роднай мовы – і шмат чаго яшчэ не могуць, зразумела, спрыяць развіццю грамадскай актыўнасці і свядомасці людзей, а тым больш іх грамадзянскай смеласці і адзінству.

І ўсё ж як ніколі і нічога іншага не баіцца ўлада так, як гэтых людзей – ці набярэцца сёння ў горадзе іх больш чым 50 чалавек, – якія штогод адкрыта выказваюць сваю прыхільнасць Бацькаўшчыне і спрадвечным ідэалам Волі і Незалежнасці.

Яны ішлі да месца мітынгу з разгорнутымі Нацыянальнымі Сцягамі, упрыгожанымі святочнымі паветранымі шарамі. Са многімі побач былі дзеці з бел-чырвона-белымі сцяжкамі. Першае, што зрабілі ўсе, прыбыўшы на месца мітынгу, – заспявалі. "А наперадзе ўсіх Костусь Каліноўскі ... І калі спатрэбяцца Бацькаўшчыне ізноў сэрцы і далоні ўсіх яе сыноў... Потым былі кароткія віншавальныя выступы. Адбыўся сымбалічны Акт прыняцця жадаючых у грамадзянства Беларускай Народнай Рэспублікі.

Пасля святочны дзень працягваўся ў доме культуры самадзейным канцэртам. Яшчэ пазней у адной з кавярняў горада адбылася святочная сяброўская вячэра.

... Выканаўшы сваё складанае заданне "по охране общественного порядка от национальных экстремистов", раз'ехалася з месца падзеі міліцэйскае начальства. Пешшу разышоўся ад ДК "рядовой и сержантский состав". Пабеглі праяўляць плёнку міліцэйскі фатограф і праглядаць відэастужку міліцэйскі тэлеаператар.

Некуды накіраваўся пасля мітынгу і тав. Шарснёў. Магчыма, працягваць святкаванне. У мінулую нядзелю краіна, як стала вядома з прэзыдэнцкага тэлебачання, шырока адзначыла Дзень работнікаў гандлю.



Генадзь СУДНІК

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

Акрамя прэзыдэнта і кіраўнікоў падначаленых яму сілавых ведамстваў і ўзброеных структураў, актыўнымі ўдзельнікамі дзяржаўнага перавароту пад выглядам так званага лістападаўскага (1996 г.) рэферэндуму, зьяўляюцца шэраг іншых дзяржаўных чыноўнікаў і, на жаль, некаторыя дэпутаты Вярхоўнага Савету. Усе яны груба парушылі 3-ці артыкул Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г., у якім гаворыцца, што любыя дзеяньні, накіраваныя на дасягненне дзяржаўнай улады гвалтоўнымі сродкамі, а таксама шляхам парушэньняў іншых законаў РБ, караюцца паводле закону. Дэпутаты Вярхоўнага Савету вельмі слушна зрабілі, распрацаваўшы праект закону "Аб неўжываньні тэрмінаў даўнасці за здзяйсненне службовымі асобамі злачынстваў, якія парушаюць правы й свабоды грамадзянаў", бо гэтыя злачынствы пасля дзяржаўнага перавароту адбываюцца ў краіне амаль кожны дзень, а бывае – і па некалькі разоў на дзень.

Сямён ШАРЭЦКІ,
старшыня Вярхоўнага Савету РБ

Выказванне спікера парлямэнту добра ілюструе рэпартаж нашага карэспандэнта з Цэнтральнага райаддзелу міліцыі, дзе 23 сакавіка адбыўся суд над магілёўскімі маладымі патрыётамі **(чытайце на 2-й стар.)**

"IDEE" прывезла ў Магілёў не толькі свае ідэі, але цікавілася і мясцовымі

Некалькі дзён у Магілёве з рабочым візытам правяла дэлегацыя міжнароднага грамадскага Фонда IDEE, штаб-кватэра якога знаходзіцца ў Варшаве. Назва Фонду расшыфроўваецца як Інстытут падтрымкі дэмакратыі ў краінах Усходняй Эўропы. З многімі недзяржаўнымі арганізацыямі ў нас Фонд мае даўнія, трывалыя і, галоўнае, эфектыўныя стасункі, якія рэалізуюцца ў справах на карысць станаўлення адкрытага грамадства. Гэтым разам ягоны варшаўскі прадстаўнік Павал Казанэцкі, які, не можам гэтага не падкрэсліць, выдатна валодае беларускай мовай, адрасам сваёй камандзіроўкі выбраў асацыяцыю "Кола сяброў". Мы ўжо паведамлялі, што па ініцыятыве і пры арганізацыйнай падтрымцы гэтай асацыяцыі ў Магілёве створаны Цэнтар грамадскіх сувязяў, у які адлачатку ўвайшлі дзесяць найбольш уплывовых і рэальна працуючых недзяржаўных арганізацый. Павал Казанэцкі разам з сябрамі дэлегацыі, у ліку якой быў і кіраўнік Асамблеі недзяржаўных арганізацый Беларусі Уладзімір Роўда, прысутнічалі на паседжанні Цэнтра, вывучалі ягоныя дакументы, абменьваліся думкамі з прысутнымі – і зрабілі прыемную для гаспадароў выснову, што Цэнтар распачаў працу ў правільным накірунку і мусіць стаць з цягам часу значным аб'яднаўчым, рэсурсавым і мэтадычным штабам недзяржаўных арганізацый, якія складаюць такі патрэбны для развіцця дэмакратыі Трэцці сэктар.

Дэлегацыя таксама прысутнічала на дружалюбнай вячэры з нагоды першай гадавіны нашага ТЫДНЁВІКА. Разам з рэдакцыяй і заснавальнікамі абмеркавала пэрспектывы выдання, выказаўшы падтрымку канцэптуальнаму накірунку газэты, якая адкрыта арыентуецца на нацыянальныя і дэмакратычныя каштоўнасці.

Падрабязныя і слушныя сустрэчы адбыліся ў пасланцаў IDEE з магілёўскімі праваабаронцамі, актывістамі свабодных прафсаюзаў. Шмат што карыснага для сябе, што можа стаць асновай для далейшых больш эфектыўных узаемных дачыненняў, знайшлі госці падчас наведвання некаторых грамадскіх арганізацый у Шклове, Чавусах, Чэрыкаве, Горках, Быхаве, Бабруйску, Асіповічах, Кіраўску. Няма чаго казаць, апошнім часам з-за супрацьдзеяння грамадскай ініцыятыве з боку ўладаў на месцах актыўнасць людзей пайшла на спад. Аднак многія не згубілі настрою і жадання служыць грамадскім мэтам усталявання ў дзяржаве дэмакратыі, правоў чалавека, свабоды распаўсюджвання інфармацыі. Гасцям справядліва падалося, што Магілёўшчына на гэтай пачэснай ніве яшчэ прамовіць сваё важкае слова. Прадстаўнікі Фонда IDEE са свайго боку абяцалі падтрымку новых цікавых ідэй і намаганняў у гэтым кірунку. Бо, як гэта часта адзначалася ў ходзе шматлікіх сустрэчаў, вольная дэмакратычная Беларусь – ёсць пэрспектыўная мэта і здабытак усёй цывілізаванай Эўропы.

Аддзел навінаў ТМ

РАБОЧЫ АЛЕСЬ АСІПЦОЎ І СТУДЭНТ ДЗЯНІС НОВІКАЎ – НОВЫЯ АХВЯРЫ ДЫКТАТАРСКАГА РЭЖЫМУ. АЛЕ ЯНЫ ВЫЙШЛІ НА СВАБОДУ З-ЗА КРАТАЎ ПАСЛЯ 1,5 СУТАК ЗНЯВОЛЕННЯ. БЕЗПАДСТАЎНАСЦЬ ГВАЛТУ НАД ІМІ ВЫМУШАНЫ БЫЎ ЗАСВЕДЧЫЦЬ НАВАТ НАШ ЦЯПЕРАШНІ СУД.

Нешматлікая святочная калёна ў Магілёве ў дзень святкавання 80-х угодкаў БНР нядзельнай раніцай адразу заўважыла недахоп двух актывістаў – старшыні згуртавання "Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу" Алеся Асіпцова і сябра гэтай арганізацыі, нашага карэспандэнта Дзяніса Новікава. Хутка высветлілася, што напярэдадні вечарам яны былі затрыманыя міліцыянтамі, гвалтам дастаўленыя ў міліцыю, а адтуль – да панядзелкавага суда – у следчы ізалятар.

І вось ён – суд. Прысутнічаць на ім прыйшлі сябры затрыманых, старшыня мясцовага аддзялення Беларускага Хельсінскага Камітэта Валеры Сівуха, колішні лідэр згуртавання патрыётаў Валадар Цурпанаў, сябры Хрысціянскага сацыял-дэмакратычнага саюза Алесь Буракоў і Вольга Сафонава, журналіст ТЫДНЁВІКА. Зразумела, што тут былі родныя і блізкія затрыманых.

Пералічваю ўсіх так падрабязна таму, што у "залу суда", які праходзіў у памяшканні Цэнтральнага райаддзела міліцыі, нікога не дапусцілі. З такога грубага і нічым не абгрунтаванага парушэння Працэсуальнага Кодэксу і Канстытуцыі пачаўся суд. Ну, а іншыя "дэталі" ягонага афармлення можна прыводзіць бясконца. Тут вам і раптоўнае, пад уласны настрой сумуючага на варце сержанта, перыядычнае выштурхоўванне чакаючых людзей на вуліцу, каб не "мешали тут работать". Тут і міліцэйскі мат-перамат з пакою дзяжурнай часткі, агароджанай ад прысутных шкляной сценкай. Тут і суддзя, што правяла пасяджанне, седзючы перад падсуднымі ў накінутым на плечы паліто, і так да канца і не паверыўшая ў тое, што стаяўшыя перад ёй хлопцы сапраўды лепш разумеюць беларускую мову, чым расейскую.

Тым ня менш яна дапусціла ў залу перакладчыка, ролю якога ўзяў на сябе Валадар Цурпанаў. А вось бабуля Дзяніса і сястра Алеся засталіся ў калідоры, дзе ў чаканні суда ўжо правялі некалькі гадзінаў. Яны так і не пачулі "з першых вуснаў" аб тым, што ж нарабілі іх родныя хлопцы, якія раніцай пайшлі з дому ў тую суботу па сваіх справах і не вярнуліся дамоў ні ўвечары, ні наноч, ні назаўтра. Бабуля Дзяніса даведалася аб тым, што ўнук жывы, толькі вечарам у нядзелю. Можна толькі здагадвацца, якую ноч яна правяла ў адзіноце, бо жыве разам з уважлівым і клапатлівым унукам. Невядома было сваякам хлопцаў і тое, чым скончыцца суд, пасля якога яны маглі яшчэ нейкі час, а ў нашай краіне гэта магло стацца і працяглым часам, не пабачыць сваіх хлопцаў і не даведацца пра абставіны справы. Словам, гуманнасцю ад нашага суда так і прэ. Да заўвагі пра гуманнасць яшчэ дадатак: у суботу вечарам Дзяніс, хвалюючыся пра бабулю, прасіў вольнага ад службы міліцыянта прайсці некалькі метраў да суседняга дома і паведаміць пра затрыманне (міліцыя і дом у адным двары). Сержант, ці хто ён там быў, паленаваўся гэта зрабіць: а, перажывеш і ты, і твая бабуля.

За што ж і як затрымалі хлапцоў? У суботу вечарам на Піянэрскай вуліцы іх раптоўна схапілі чатыры ўзброеных міліцыянтаў, якія нечакана выскачылі з "паношанага" (відаць, для канспірацыі) "жыгулёнка". Стражы парадку патлумачылі, што нібыта шчыруюць тут, на Піянэрскай, з нагоды падазрэння на кватэрны крадзёж, які ці адбыўся ўжо, ці яшчэ мае адбыцца, – нашыя затрыманцы не зразумелі. Але зразумелі, што міліцыянты мелі заданне ўзяць менавіта іх. Тое, што гэта ня тыя "падазраваемыя", якіх нібыта шукае міліцыя, дзяжурнаму па райаддзелу было зразумела "з парога". Ведалі, што прывезлі "не тых" і захопнікі. Таму яны і пакінулі дзяжурныя пратаколы: "задержанные матерились, не подчинялись требованиям милиционеров, грубо хватались за форму" (за міліцэйскі камуфляж, у які нашыя ахоўнікі парадку апранутыя). У гэтых рапартах кожнае слова было хлуснёй, але дзяжурны адправіў затрыманых у ізалятар да панядзелкавага суда.

Ясна, што за маладымі партыётамі спэцыяльна сачылі, а іх затрыманне – не што іншае, як прэвентыўная мера з боку ўладаў напярэдадні святкавання Дня Волі. Між іншым, ні можа не звярнуць на сябе ўвагу і такая дэталь: у рапартах і пратаколах міліцыянты зараз не пішуць (за непатрэбнасцю?) такія трафарэтныя словы, як "неподчинение ЗАКОННЫМ требованиям милиционеров", гаворыцца проста "о неподчинении". Гэткая маленькая дробязь, вельмі для іх, відаць, прыемная.

Стоячы за дзвярыма "залы суда" не было чутна, пра што ішла гаворка. Мы даведаліся, што суддзя вынесла затрыманым "предупреждение". Распытваць падрабязна саміх хлопцаў у гэтыя першыя хвіліны падалося няёмкім. Спадзяемся, што яны самі ў бліжэйшы час паведамяць чытачам пра свае "прыгоды". Нам жа было бачна, што нават кароткі закратны тэрмін даецца чалавеку нялёгка, а тым больш, калі такое абыходжанне з нармальнымі людзьмі тлумачыцца нічым іншым, як толькі адкрытым пераследам іх за палітычную нелаяльнасць. Аднак самі падставы для затрымання, "афармленне" гэтага факту, адсутнасць на судзе сведкаў-міліцыянтаў (па занятасці на службе, вядома) і хоць бы аднаго доказу віны ці правапарушэння з боку затрыманых, – словам, усё было шытае такімі белымі ніткамі, што суддзі проста нічога не заставалася як выпусціць хлопцаў на свабоду.

... Сёння здарылася так. Няма аднак ніякага адчування, што міліцыя і суды наогул спыняць незаконны пераслед па палітычных матывах. Некалькі гадзінаў знаходжання ў райаддзеле хапіла для таго, каб абсалютна яскрава зразумець: тут выканаюць любы загад, і не падумаўшы пры гэтым зазірнуць у ЗАКОН, а тым больш – у маральныя святцы. Не па загаду, а па сэрцу (ці адсутнасці яго) – як ні жахліва гэта гучыць – маладыя беларускія хлопцы ў міліцэйскай вопратцы не шануюць Беларусі, яе мовы, яе святыняў. І, адпаведна, тых, хто не сталі такімі ж як яны ... Значыць, яшчэ многа благога наперадзе. На жаль.

В. С.





P. S. Тым часам стала вядома, што ў Менску пасля святочнага шэсця і мітынгу быў затрыманы магілёўскі маладафронтавец Ясь Абадоўскі, якога "за палітыку" нядаўна выключылі з інстытута (мы пісалі аб гэтым у № 1). Пасля закратнай ночы сталічны суд таксама прысудзіў яму "предупреждение". І яшчэ інфармацыя: на старшыню магілёўскай арганізацыі БНФ Анатоля Фёдарава міліцыя склала пратакол "за несанкционированное шествие участников митинга", што пагражае яму грашовым пакараннем.

Здаецца, іншых стратаў дэмакратычныя шэрагі Магілёва пад час святкавання 80-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі не панеслі. На нашую думку, аднак, прыведзеных фактаў цалкам дастаткова, каб магілёўская грамадскасць яшчэ раз пераканалася, які рэжым сёння валадарыць у краіне.

Аддзел навінаў ТМ

ХАРТИЯ 97

1. Карпинов Е.Б.
2. Чмырихов Б.И.
3. Тверской Н.И.
4. Авдеева А.К.
5. Вислоус В.Г.
6. Усиков В.А.
7. Халанеев Г.В.
8. Минова Е.А.
9. Дойгнева И.С.
10. Васьковский С.Г.
11. Аников А.А.
12. Брагенников
13. Дорожко Г.Д.
14. Мозгиго С.С.
15. Жуков А.Н.
16. Заливано С.
17. Лапиков А.М.
18. [illegible]
19. Кулешов И.В.
20. Кулешова В.А.
21. Шилова А.В.
22. Кинев С.А.
23. Николаенков В.В.
24. Асиенкова
25. [illegible]
26. Клинцова А.И.
27. Клименков В.Б.
28. Асиенко Н.А.
29. Лапиков А.И.
30. Тельнов В.И.
31. Клищенков А.А.
32. Дубяга А.Л.
33. Дубяга Т.А.
34. Ковалев В.И.
35. Ефимович В.Н.
36. Аксаментов Г.Г.
37. Белицкий А.С.
38. Черкасова А.А.
39. Тельмизский
40. Лопатко И.И.
41. Земцев В.П.
42. Новикова Л.А.
43. Захарова Л.Ю.
44. Ефременко Н.И.
45. Хорланков П.С.
46. Семин А.А.
47. Цыбульский А.А.
48. Сидоров В.А.
49. Дыбовик В.П.
50. Ковалева С.И.
51. Васильев В.Ф.
52. Рогова Е.В.
53. Мотиков В.А.
54. Малинкова И.В.
55. Ермаченко В.И.
56. Платоненко А.В.
57. Пугнов Э.В.

ДАВЕДКА: Гэтые подпісы сабраны у жніўні дому Рабочага пасёлка за две гадзіны

март 1998 г.

Што можа быць больш пераканаўчым за дакумэнты...

БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ

У 1996 годзе ў Нью-Ёрку пабачыла свет кніга вядомага дзеяча беларускага руху Юркі Віцьбіча "Антыбальшавіцкія паўстаньні і партызанская барацьба на Беларусі".

У ёй аўтар узгадвае буйныя, дробныя і нават нязначныя выступы беларусаў са зброяй у руках супраць камуністычнай улады ў 20-30 гады XX ст. Безумоўна, у сувязі з тым, што кніга пісалася на эміграцыі, у адарванасці ад беларускіх архіваў на радзіме, па-за ўвагай засталося яшчэ шмат фактаў і прыкладаў узброенай барацьбы супраць Саветаў. Матэрыялы аб гэтым захоўваюцца ў дзяржаўных архівах і толькі зусім нядаўна навукоўцы змаглі працаваць з імі. ТЫДНЁВІК ужо пісаў пра малавядомае Прапойскае (Слаўгарадскае) паўстанне 1919-1929 г.г., пра партызанскія атрады на тэрыторыі Магілёўскага раёна, якія дзейнічалі ў 1919-1934 г.г. Сёння вашай увазе прапаноўваецца шэраг дакумэнтаў з Магілёўскага архіва, якія сведчаць, з якой жорсткасцю тагачасны рэжым распраўляўся з іншадумцамі. Пакінута да друку галоўнае, прапушчаны агульныя лёзунгі, заклікі і нязначная інфармацыя. З дакумэнтаў бачна наколькі масавы быў рух за волю, калі яго прымалі за "Добровольческую армию", бачна падтрымка яго нават з боку мясцовай улады (сельсаветаў), сфарміраванай з звычайных сялян.

Колькі слоў пра дакумэнт за 1921 год – "Даклад ад дзейнасці выязной сесіі рэўваентрыбунала ў перыяд ліпеня 1921 г.. У архіве захавалася копія. Але найбольш цікавы адзін абзац, які прыведзены цалкам. Тут яшчэ не прастаўлены лічбы – колькі паступіла справаў, колькі разгледжана і г.д., а колькасць растраляных – пазначаная, прычым не самапіскай, а надрукаваная. Можна меркаваць пра давядзенне неабходнай лічбы растраляных "зверху", загадзя, да выезду на месцы дзейнасці паўстанцаў.

Дакумэнты друкуюцца на мове арыгіналу.

А. КРАСНАСЛАБОДЦАЎ,
гісторык

ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ ГРАМАДСКІХ АБ'ЯДНАННЯЎ МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Фонд № 6573 "Бобруйский Уездный комитет КПБ".

Вопіс 1, справа № 55 "Циркуляры ЦК РКП (б) и ЦБ КП(б)Б,

секретная переписка по борьбе с бандитизмом на территории Белоруссии" (1921 год).

а. 20 <u>Доклад осведомителя</u>.

... в Бобруйском уезде слухи, что согласно пунктам Рижского договора большевики должны покинуть Белорусь. Развивающийся бандитизм считают Добровольческой армией, которая помогает избавиться от большевиков. Этому верит часть населения ....

а. 32 <u>Секретная директива Совнаркома Беларуси от 28 мая 1921 г.</u>
<u>за № 56</u>

Бандитизм на территории Белоруссии доходит до крайних пределов, который поддерживается реально всеми средствами, а также белыми офицерами из армии бандита Балаховича и получает политическую окраску от эсера Савинкова ...

... Для искоренения ряд мер:

1. провести широкую агитацию о вреде который наносит бандитизм и провести агитацию против антисемитизма

...

3.обратить внимание на отпускных красноармейцев, трудоустраивать их, иначе они ... являются зачастую верным резервом бандитских шаек ...

5. учитывая пассивность вол. и сельсоветов в деле борьбы с бандитизмом (зачастую поддержание последнего) ... заменить состав неустойчивых ... создать волревкомы по согласованию с НКВД ...

6. для предотвращения бандитизма и поддержки бандитов необходимо применить метод конфискации имущества бандитов и их семейств ...

а. 32 адв. ... 9. Предревтрибуналу Белоруссии создать выездные сессии Ревтрибуналов в Мозырском, Бобруйском, Игуменском, Слуцком уездах ... выезды на места при отрядах и производить суд, обставляя процесс такового торжественно и публично, втягивая ... окрестное население и выносить приговоры жестокие, вплоть до расстрела ...

10. оповестить, что бандиту грозит расстрел, а село или деревню, поддерживающие бандитизм Советская власть будет принуждена сжигать, как гнёзда, где находит себе приют этот бандитизм, во имя сохранения Красной революционной крестьянской деревни ...

Зам. предсовнаркома по борьбе с бандитизмом,

нарком военный и наркомвнутдел И.Адамович

Секретарь совнаркома Клишевский

а. 37 <u>Телеграмма</u> за № 23 от 6.06.21г. Председателю Ревтрибунала 8 дивизии и укомпарт Бобруйского уезда из штабдива 8-го. Бобруйск, во исполнение Военсовета от 27 мая 1921 г. Срочно секретно.

На основании своего постановления от 19 мая 1921 военсовет предлагает сконструировать выездную сессию революционного трибунала в составе: 1. председатель (представитель от РВТ 8-й дивизии), 2 члена (от дивизии и укома) и незамедлительно выехать на место операции отряда т. Байкалова в м. Глуск.

Все дела по обвинению в бандитизме должны быть без всякого промедления заслушиваемы на местах и решения трибунала носить характер беспощадно карающий всех виновных не только в его прямом проявлении, но и в содействии так или иначе ему.

Печать. Предвоенсовета Мордвинов.

а. 39 <u>Літ ад 15.07.21г. у Укампарты</u>

(копія загада Рэўваенсавета г. Мінска № 04 ад 11.07.21г.)

... 1. на территории Белоруссии существует военное положение ...

... 3. ... все граждане за укрывательство бандитов, явную или тайную помощь понесут кару вплоть до расстрела. Имущество будет конфисковано, а вся семья будет выселена на принудительные работы за пределы Советской Белоруссии ...

... 5. семьи неявившихся бандитов арестовывать, имущество конфисковывать и распределить между честными и верными Советской власти крестьянами ...

а. 39 адв ... 6 ... бандиты знайте, что ваши имена и местожительство ваших семей военному командыванию и органам ЧК известны ...

... приказ напечатать на русском, белорусском, польском, еврейских языках.

Падпісалі Уборевич, Адамович, Ольский, Венцов.

аа. 41-41 адв. <u>Секретная копия</u>.Секретарю Укомпарта от

председателя Выездсессии РВТ 8-й дивизии Гамиловского

Филиппа Фёдоровича.

Доклад о деятельности выездсессии в период июля 1921г.

... охвачен район Касаричи, Балашевичи, Козловичи, Глушь-Горбацевичи, Глуск ... Ст.Дороги ... м.Уречье ... таким образом работа, хотя и имела много дел, не могла бы выразиться в большие цифровые данные. За весь этот период (3–30.07) поступило дел

___ разобрано дел ___ расстреляно 15, приговорено к лишению свободы ___ условно ___ выселено ___ передано ___ прекращено ___ ...

Подпись

Аб'ява Магілёўскага таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны

14–15 траўня 1998 года Магілёўскае ТБМ імя Францішка Скарыны праводзіць навукова-практычную канфэрэнцыю "Беларуская мова: стан ужытку пасля рэфэрэндуму".

Запрашаюцца да ўдзелу навукоўцы, настаўнікі, журналісты, грамадскія і дзяржаўныя дзеячы. Да пачатку канфэрэнцыі будзе выдадзены зборнік. Тэзісы ў памеры да 3-х старонак да 5 красавіка дасылаць на адрас: 212038, Магілёў, праспэкт Дзімітрава, 54-153.

Іншую інфармацыю можна атрымаць па тэлефонах: 42-44-40, 26-70-86, 22-70-51.

АРГКАМІТЭТ

НАПЯРЭДАДНІ АБЛАСНОЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ТБМ





Шклоў. Тут адбыўся раённы справаздачны сход сяброў Таварыства беларускай мовы. Два гады працуе арганізацыя, што аб'ядноўвае патрыётаў матчынай мовы. Актывісты адзначылі, што вяртанне мовы ў службовы і жыццёвы побыт апошнім часам зноў перажывае відавочны "адкат". Яны з сумам успаміналі нядаўнія часы адраджэнскага руху, калі здавалася, што яшчэ няшмат – і мы ўсе ўспомнім, хто мы ёсць. Мову тады можна было пачуць у калідорах улады, ніхто не толькі не саромеўся на ёй размаўляць, але ганарыўся гэтым. Зараз усё больш складана. Удзельнікі сходу не хавалі таго, што моўная сытуацыя змянілася да горшага, калі пачаў праводзіцца "новы курс" кіраўніцтвам краіны. Цікава, што мясцовая "вертыкаль" не абмінула сход увагай, накіраваўшы сюды свайго прадстаўніка. Сход прыняў адмысловы зварот да раённага кіраўніцтва. Толькі ці дасць ён плён?

Пакуль жа сход вырашыў не здавацца ў сваёй барацьбе за мову, актывізаваць прапагандысцкую і растлумачальную работу, а галоўнае – весці кантроль за ходам выканання Закону аб мовах.

На здымках: падчас гаворкі на актуальную тэму; справаздачу перад сябрамі робіць старшыня мясцовага аддзялення ТБМ сп. А. Грудзіна.

Тралейбус ці рэстаран?

Бабруйская гарадская арганізацыя Народнага Фронту па просьбе жыхароў вывучала транспартную праблему ў 5-м і 6-м мікрараёнах горада. Праблема гэта для горада найвастрэйшая, вядомая ўжо каля 10 гадоў. Асабліва цяжка прыходзіцца рабочым, якія едуць на працу раней за ўсіх. Мы сабралі 1.184 подпісы пад патрабаваннем пуску тралейбуса. Акцыя праводзілася з кастрычніка 1997 г. да студзеня 1998 г.

5 лютага 1998 г. за № 3 намі быў накіраваны ліст (ён зарэгістраваны ў гарвыканкаме за № 225/02-07) з копіямі подпісных аркушаў да старшыні выканкама У. Раманоўскага. Пісьмовага адказу на гэтыя звароты да гэтай пары не дачакаліся. Цяпер чакаем з абласнога цэнтра.

Замест гаворкі на хвалюючую людзей тэму мы атрымалі з гарвыканкаму пагрозы: "Не занимайся х...й! Я тебя предупредил!" – гэта даслоўны выраз на мой адрас, як гаворыцца – на нормальном русском языке – з боку старшыні Раманоўскага. Маральная ці фізічная расправа паследуе за гэтым, – пакажа час. Але мы, не гледзячы ні на што, будзем працягваць дамагацца свайго, бо гэта трэба людзям.

Магчыма, што наш мэр не хоча дзяліцца з намі, так бы мовіць, лаўрамі пры вырашэнні пытання пра пуск тралейбуса. Мы ж іх яму саступім, толькі б пайшоў тралейбус. А "пераможны" лаўровы вянок тав. Раманоўскі можа павесіць на прэзідэнцкі партрэт у сваім кабінеце.

Адначасова з тым, як мы звярнуліся да транспартнай праблемы, у гарадскіх газетах з'явілася паведамленне, у якім нас абвінавацілі [illegible] і фальсіфікацыях пры зборы подпісаў. [illegible] Праўда, некаторыя газеты дазволілі і нам самім [illegible] паведамленне і абвергнуць яго. А вось "Бабруйскае жыццё", [illegible] начальству, такой магчымасці нам не прадставіла. Таму будзе цяпер адказваць за хлусню перад судом, куды мы звярнуліся пры дапамозе рэгіянальнага аддзялення Беларускага Хэльсінскага Камітэта.

Вось яшчэ што цікавае ў сувязі з нашай транспартнай [illegible]. Пад гэтую праблему ў горадзе панавыбіралі ледзь не ўсіх дэпутатаў розных узроўняў. Першы клопат і абяцанне кожнага з іх (а большасць складае, зразумела, рознае начальства), заўсёды былі "тралейбуснымі". Яны даўно ў дэпутатах, а тралейбуса як не было, так і няма. Мала таго, год назад сам прэзыдэнт, будучы ў Бабруйску, не пасквапіўся на абяцанне "даць народу тралейбус". Не ведаем, як увесь "народ", а мы, фронтаўцы, цану ягоным абяцанням ведаем даўно. Здаецца, і іншыя людзі пачынаюць нарэшце адчыняць вочы, гледзячы на рэальнае жыццё і ўспамінаючы перадвыбарчыя лукашэнкаўскія абяцанкі.

Было ў іх, гэтых абяцанках, як памятаеце, і такое: даць усё таму ж народу маёмасць, вярнуць яе ад тых, хто нахапаў, падзяліцца з людзьмі дзяржаўнай маёмасцю. Той, хто паверыў, чакае гэтага ўжо чацверты год. У нашага камуністычнага мэра штонебудзь возьмеш, як жа! Ён прызнае толькі "государственную собственность, которая служит на благо", ну і г.д. А вось жыхары пазначаных вышэй мікрараёнаў прапануюць прадаць прыватнікам рэстаран, бары, кафэ. І на гэтыя грошы запусціць тралейбус. Магчыма таксама, што іх хапіла б на тое, каб дабудаваць паліклініку і гандлёвы цэнтар. Хаця не адзін, канешне, тав. Раманоўскі вінаваты ў тым, што "всё у нас народное, всё вокруг моё". Ніякіх, тым больш даўно наспеўшых рэформ не праводзіць прэзыдэнт, які таксама больш за ўсіх "клапоціцца" пра народна-дзяржаўнае. Гэтая палітыка і заганяе людзей у жабрацкую пастку. Мы гэта тлумачым, паказваем на прыкладах. Усё больш людзей вераць нам. Яны бачаць, што мы "не да ўлады ірвемся", а дапамагаем людзям у іх рэальных сацыяльных праблемах. Не наша віна ў тым, што гэтая дапамога часцей за ўсё не больш, чым маральная. Што можна зрабіць, калі "вертыкальны таварыш" замест вырашэння праблемаў гаворыць з людзьмі, што лезуць з гэтымі праблемамі, на даходлівай (для яго, найперш) расейскай мове (прыклад глядзі вышэй).

Вячаслаў СВІЗУНОЎ,
старшыня Бабруйскай гарадской арганізацыі БНФ,
сябра Сойму Беларускага Народнага Фронту

Старонкі "братэрскай любові"

Пра ўзаемаадносіны двух суседніх народаў, беларускага і расейскага, надрукавана шмат літаратуры. І амаль заўсёды ў ёй можна сустрэць пра вялікую любоў да нас, беларусаў, з боку "старэйшых братоў". Я не маю намеру навукова-абгрунтавана аспрэчваць гэтыя высновы. Аднак пацікавіўся гістарычным лёсам толькі аднаго невялікага беларускага горада, роднага мне Шклова. Агульнавядома, што гісторыя складаецца не толькі з дзяржаўных, але і са шматлікіх канкрэтных лёсаў і падзей. Гістарычныя крыніцы непасрэдна пра Шклоў паведамляюць наступнае.

1535 год – адно з першых дакумэнтальных сведчанняў пра Шклоў. І адразу даведваемся, што горад быў спалены расейскім ваяводам В.Шуйскім у часе вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім Княствам Літоўскім.

1562, 1564, 1581 гады – Шклоў і ваколіцы спальваюцца расейскімі войскамі ў часе Лівонскай вайны.

1654 год – аблога Шклова расейскім ваяводай А. Трубяцкім, якая працягвалася з 20 па 31 жніўня, пасля чаго горад здаўся.

1655 год – Шкловам завалодалі й абрабавалі яго казакі пад камандваннем Залатарэнкі.

1660 год – жыхары Шклова двойчы зрабілі напады на маскоўскіх ратнікаў. Першы раз, калі тыя перавозілі на стругах па Дняпры хлебныя запасы, порах і канаты ў Магілёў. Другі раз – калі да Шклова падступілі расейскія войскі П. Даўгарукава і М.Рціщчава. Пасля чатырох гадзінаў бою расейцы адступілі.

1772 год – Шклоў апынуўся ў складзе Расейскай імпэрыі. Калі ў першай палове 17 стагоддзя да пачатку вялікіх ваенных дзеянняў (вайна з Маскоўскай дзяржавай і Паўночная вайна) горад па сваіх памерах і колькасці жыхароў займаў сёмае месца пасля Вільні, Магілёва, Берасьця, Слуцка, Менска й Полацка, то ў складзе імпэрыі ён канчатковаператварыўся ў невялікае мястэчка, дзе пражывала каля сямі тысяч чалавек.

Не так проста аказалася высвеятліць адносіны "брацкіх народаў" падчас іх сумеснага пражывання ў складзе іншай імпэрыі – СССР. Між тым напачатку яе існавання, як вядома, спрадвечныя беларускія землі апынуліся ў складзе непасрэдна РСФСР. Савецкі ўрад па патрабаванні насельніцтва, падтрыманага беларускім (савецкім) урадам, а найбольш – па міжнародных абставінах (*каб болей паелічыць варожасць да Польшчы і нават наблізіць рэвалюцыю да Германіі* – гэта ўсё цытаты з навуковых даследванняў – **ТМ**), прыняў рашэнне аб вяртанні ў склад Беларусі тэрыторый часткі Гомельскай, Віцебскай і Смаленскай губэрній. Па ўсім дружалюбны і справядлівы гістарычны акт (за выключэннем яго матываў) быў азмрочаны. Тагачасны старшыня бээсэсэраўскага ўраду тав. Чарвякоў на паседжанні Саўнаркома дакладаў наступнае: "У нас ёсць звесткі ... што са шклоўскай фабрыкі Гомельскі губсаўнаргас (ён на той час заставаўся ў складзе Расеі) вывозіць усю маёмасць. Гомель абірае ўсе раенаддзяленні паветаў, вывозячы адтуль сыравіну і абсталяванне. Гомельскі губэрнскі кааператыў абабраў да апошняй ніткі навятовыя кааператывы."

Гэта гісторыя. Гэта праўда. Ёю можна, што называецца, па-рознаму карыстацца. Аднак аспрэчваць яе немагчыма. Між тым старонкі "вечнай дружбы" заўсёды спасылаюцца толькі на адзін бок справы, шчыруючы нават забараніць другі, або аб'явіць яго выдумкай і хлуснёй. Як раз такія "абаронцы" гістарычнай праўды і прыносяць найбольшую шкоду адносінам паміж народамі.

Я менавіта супраць таго, каб у гэтай дэлікатнай тэме за аснову браліся крайнія погляды. Усё трэба аналізаваць, разглядаць усебакова, абапірацца на навуку, надзейныя гістарычныя, а не прапагандысцкія крыніцы. Абодва народы-суседзі ад ведання праўды толькі выйграюць.

А. ГРУДЗІНА,
краязнавец

P. S. Для гэтага артыкула мной выкарыстоўваліся наступныя друкаваныя крыніцы:

1. А.С. Дембовецкий. Опыт описания Могилёвской губернии. Книга 2, Могилев на Днепре. 1884 г.

2. М.О. Без-Корнилович. Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии. СПб, 1855 г.

3. Россия. Полное географическое описание нашего отечества. Том 9, СПб, 1905 г.

4. М. Ткачоў. Замкі і людзі. Менск, 1991 г.

5. Б. Сідарэнка. Магілёў на заключным этапе Лівонскай вайны. Магілёўская даўніна, 1994 г.

6. Г. Сагановіч. Невядомая вайна. (1654-1667 г.г.). Часопіс "Спадчына" № 1, 1994 г.

7. С. Асіноўскі. Грымяць мячы булатныя ... Часопіс "Беларуская мінуўшчына" № 2, 1997 г.

"Краков! Это же древняя польская столица! Красотища!" - сказал мой "шеф", отпуская в поездку. "А какие там костёлы!" - восхищенно поведал друг. "Между прочим, в Кракове самый лучший еврейский ресторан, - заметил мой коллега.- Не в мире, конечно, а в Польше"... При этом вскоре выяснилось, что никто из них в Кракове вообше-то не был.

Я могу теперь о себе сказать: был! Целых 72 часа подряд. В еврейский ресторан не заглядывал, поскольку никто не приглашал, а сам об этой достопримечательности и не вспомнил. Костёлы действительно на каждом шагу, но сказать о них что-нибудь особенное не смогу. Услугами гидов не пользовался, поэтому в голове только эмоции и картинки, а в качестве познавательной информации для читателей врядли згодятся. Что касается общего впечатления от Кракова, то и оно незаконченное. Потенциально город действительно обладает всем тем, чем мы обычно гордимся, если это есть: архитектурным изобилием, историческим центром, памятниками, масштабностью... Не хватает, мне показалось, лоска, если так можно сказать. Такое ощущение, что сверкают только костёлы, остальные здания серы и подёрнуты патиной времени. А может быть это и есть тот самый налёт старины, который так ценится туристами. Хотя, я думаю, дело в том, что денег у местных властей недостаточно пока, этих самых денег не хватает ведь не только в Беларуси. Поэтому Краков по одному только взгляду довольно далеко отстаёт от Варшавы... Впрочем, не нам с вами, как говорится, кривить губы, если помнить из какого "очага" культуры и архитектуры мы сами.

Что касается цели моего нахождения в Кракове, то она заключалась в следуюшем: участие в международ-

для белорусов". На эти два мартовских дня в Краков меня делегировала региональная организация Белорусской Асоциации журналистов на ту часть семинара, которая касалась средств массовой информации и называлась так : "Роль независимых СМИ в демократическом государстве". А так как Польша - бесспорно, а Россия – в какой-то мере котируются в сравнении с Беларусью по этому "показателю" несравненно выше, то не было ничего удивительного в том, что о роли независимых СМИ в нашей стране дискутировали россияне и поляки. Но и наши участники семинара довольно быстро адаптировались и вскоре из слушателей превратились в преподавателей. Тем более, что нам всё же "из своего погреба" виднее наши проблемы.

Да к тому же престижный уровень семинара с белорусской стороны был довольно высок. Судите сами - нашу сторону представляли НАВІНЫ (Свабода), СВОБОДНЫЕ НОВОСТИ, БЕЛОРУССКИЙ РЫНОК, БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЖЁЖНАЯ, НАША НІВА, агенство БЕЛАПАН. А в именах это выглядело так: Юрий Дракохруст, Вадим Казначеев, Константин Скуратович, Ольга Ипатова, Семен Букчин, Сергей Законников. Нашу "команду" венчало имя Станислава Шушкевича, с российской стороны это было Галина Старовойтова, а с польской – директор Института изучения стратегических инициатив по развитию демократии в Восточной Европе. Эти трое, к слову, были инициаторами и всего нашего международного семинара.

О его концептуальной, содержательной и дискуссионой сторонах вы сможете прочитать в следуюшем материале.

Сергей ШИШКИН

Цудоўны з[redacted]

Выдатным заканчэннем шэрага мерапрыемстваў з нагоды 80-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі ў Магілёве сталася тэатральная вечарына, якая адбылася ўчора ў гарадскім Доме культуры. Цёплы, пранікнёны тэатральны вечар сабраў у зале шматлікіх прыхільнікаў беларускага слова, беларускай клясычнай драматургіі й рэжысёрска-акторскай творчасці нястомнага Валянціна Іванавіча Ермаловіча. І ўчора ён, як звы-[redacted] з нагоды гадавіны Беларускай Народнай Рэспублікі. Хаця афіцыйна вечарына была прысвечана круглым гадавінам жыцця пазначаных вышэй патрыётаў і творцаў. Але хто сказаў, што і гэтыя выдатныя беларусы мінулага не былі ў ліку тых людзей, чыі жыцці і дзеянні натхнялі творцаў Вольнай Бацькаўшчыны?

МУЗЫЧНАЯ ГАСЬЦЁЎНЯ ТЫДНЁВІКА

Сьпяваем пра тое, ува што верым

Спэцыяльна для ТМ славуты беларускі гурт "NRM" (Лявон Вольскі, Піт Паўлаў, Юрась Ляўкоў, Алег Дзямідовіч) даў інтэрв'ю, якое занітаваў у Менску наш карэспандэнт ***Алег Марозаў****.*

– Калі згуртаваўся NRM?

– Даўно, яшчэ на пачатку 80-х гадоў. Тады гэта была "Мроя". Тры гады назад мы зьмянілі назву, але склад музыкантаў застаўся ранейшым. Наша музыка стала больш жорсткай і простай адначасова, і цалкам гітарнай. З аднаго боку гэта была рызыка, але ж было й цікава. Мы не ведалі, як нас прымуць пад іншай назвай і з новымі песьнямі. Зараз ужо можна сказаць, што мы зрабілі правільны крок. З кожным годам расла нашая папулярнасьць, а ў пачатку года мы атрымалі Рок-карону як самы папулярны рок-гурт у Беларусі. Так што мы адчуваем сябе маладымі, і наш творчы патэнцыял яшчэ далёка не выкарыстаны.

– Хто піша тэксты й музыку?

– Тут трэба адразу адзначыць, што ў нас калектыўная творчасць. Гэтак было з самага пачатку існаваньня "Мроі", а потым і ў NRM. Кожны музыкант нешта сваё ўносіць ў песьню.

– У якіх краінах вы былі з канцэртамі?

– Даводзілася выступаць у розных краінах. Прымалі нас заўсёды вельмі цёпла, з відавочнай зацікаўленасьцю. Мы выступалі ў Латвіі, Францыі, Украіне. А ў Данію ездзілі разам з Касяй Камоцкай.

– Вы былі ў Магілёве. Якія ўражаньні засталіся ад гораду?

– У Магілёве мы даўно не выступалі. Старыя ўражаньні ад гораду і публікі вельмі добрыя. Шкада, што сёньня рэдка праводзяцца рок-фэсты ў параўнаньні з канцом 80-х. Мы гатовыя прыехаць да вас з канцэртамі. Да таго ж, у Магілёве вельмі прыгожыя паненкі.

– Як вы ставіцеся да сваіх "фэнаў"?

– Ну як можна ставіцца да сваіх прыхільнікаў? Дзякуй ім за тое, што яны ёсць. Гэта вельмі прыемна, што наша музыка падабаецца людзям, што яе слухаюць на касэтах, прыходзяць на канцэрты, сьпяваюць разам з намі. Вось адзін прыклад. Месяц таму мы гралі ў рок-клюбе "Акварыюм" у Менску. Здарылася так, што пасярод песьні адключылася электрычнасьць і можна было пачуць толькі барабаны. Дык вось фэны прасьпявалі цэлы куплет, і гэта было ня менш гучна і моцна, чым у нашым выкананьні пры дапамозе ўзмацняльнай апаратуры!

– Якія замежныя гурты вы слухаеце?

– Розныя. Пералічаць іх няма сэнсу. Нам падабаецца энэргічная й эмацыянальная музыка.

– А сярод айчынных?

– Беларускія гурты мы слухаем "у жывую" на канцэртах. Наша рок-музыка вельмі разнастайная, і калі маладая каманда таленавітая, то яна адразу ж набывае сябе папулярнасьць. Нават калі сьпяваюць па-ангельску, гэта ўсё роўна наша, беларускае.

– Каго вы бачыце ідэяльным прэзыдэнтам краіны?

– Чалавека, які б хваляваўся аб народзе й міжнародным аўтарытэце Беларусі, каб гэта было бачна па рэальных і канкрэтных справах. Пра [illegible]. У нашых песьнях, здаецца, прамой "палітыкі" няма, нас больш хвалююць нацыянальныя, сацыяльныя і агульначалавечыя пытаньні, якія мы і спрабуем адлюстраваць у сваёй творчасьці.

– Планы на будучыню?

– Планаў не складаем, таму што заўсёды адбываецца па-іншаму. Ёсьць новы матэрыял. Задача ў тым, каб яго запісаць.

– Што пажадаеце нашым чытачам?

– Чытачам ТМ мы жадаем моцнай веры, надзеі й любові. Рэалізацыі сваіх патэнцыяльных магчымасьцяў, радасьці і вясновага настрою.

МАГІЛЁЎ: ДАЎНІНА І СУЧАСНАСЦЬ

Гістарычны агляд І.Марзалюка

Як святкавалі ў Магілёве ў XVI–XVIII стст?

Святкаванні важнейшых рэлігійных святаў праводзіліся вельмі багата. Перад кожным з іх абавязкова падмяталіся вуліцы, падтрымлівалася чысціня ў дамах і гарадскіх установах. Перад тройцай звычайна для аздаблення набывалі "май", г.зн. бярозкі. Падкрэслім, што як агульнагарадскія святкаваліся і праваслаўныя, і рымакаталіцкія святы, на працягу іх забаранялася працаваць.

Падчас святаў салютавалі гарматы, а па вуліцах паважна ішлі працэсіі ўсіх гарадскіх цэхаў з уласнымі харугвамі. Наперадзе лунала гарадская харугва. Яна была "...чырвоная, з крыжом нябескім (г.зн. блакітным)". Кожны з магілёўскіх цэхаў таксама меў свой адметны герб. Апісанні асобных з іх дайшлі да нас. Так, цэх кравецкі меў "... харугву, на которой за герб крюк желтый і ножницы кравецкие ў белым поли", магілёўскім кавалям была нададзена "...за герб Пагоня... гды [redacted] ужывалі ў якасці герба выяву Святога Хрыстафора, але ўжо у 1654г. купцам быў нададзены герб з выявай анёла "з вагамі і крыжом стоячага".

Асаблівай пашанай карысталася свята Св.Міколы. У дзень "святого отца Николы великого", гэтак, як і "зимнего" альбо "осеннего", існаваў звычай змацоўваць грашовыя пагадненні. Лічылася, што грашовыя дамовы, падпісаныя ў гэты дзень, будуць мець большы поспех і спрыянне. Падобнае значэнне мела свята апосталаў Пятра і Паўла, прарока Іллі. Таксама святкавалі "Рождество Яна Крестителя", Святога Афанасія (у студзені), Св.Марціна (у красавіку і кастрычніку), восеньскія Дзяды – "Дмитриева Суббота" і "день Маковея" (жнівень).

Вельмі шырока святкаваліся "Крещение Господа Иисуса Христа", "Звестование пани Марии", Уваход Гасподні ў Ерусалім (іншыя назвы – Вербная альбо "цветная неделя"), Вялікдзень, ён жа – "свято хвалебное" альбо "день з мертвых встаня пана Христусового" ці "свято великоноцное". За суботай "великоденной" напрыканцы самога "свята великоденного" і велікодным панядзелкам ішла "неделя переводная" і Радуніца, "Вознесенье Христово", Дзень Святога Духа, Святога Спаса (жнівень), "День Пречистое" (Успенне Багародзіцы) і "Нарожения Пресвятой Богородицы свято опоследнее", "День Святой Покровы" ці "Святого Покрова" (Дзень Покрыва Багародзіцы) і Дзень Раства Хрыстова ("Божага Нароженя").

Святочна адзначалі "сёмую суботу" і "дзесятую пятніцу". Перад Раством, Пасхай, Пятром і Спасам адпраўлялі "запусты", за якімі ішоў пост (запусты "Філіпавы", "масляныя", "Пятровы" і "Святога Спаса").

Вельмі пышна сустракалі і знакамітых, важных персонаў. Падчас такіх сустрэчаў гараджане мусілі апранацца належным чынам. Статут купецкага брацтва абавязваў, "каб у выпадку агляду альбо сустрэчы пры ўездзе ў горад я. вял. караля альбо высакароднага сенатара... мы, усе купцы,...павінны будзем выступаць конна, пагусарскі, са сцягам і барабанам, усе без выключэння".

Уплывовым гараджанам, а таксама іх дарослым дзецям і жонкам перад самым Новым годам магістрат звычайна падносіў падарункі – "валочобное", якое складалася з дарагіх прыпраў, прадуктаў харчавання, грошаў. Шырока практыкавалася магістратам і іншае абавязковае прынашэнне – "коляда". Штогод у снежні найбольш уплывовым людзям горада рабіліся калядныя грашовыя падарункі. [redacted] нем, паколькі падобнае адбывалася і ў шэрагу іншых выпадкаў. Тэатральныя відовішчы ладзіліся не толькі ў ратушы, але і ў цэрквах.

Неафіцыйная частка святаў, як агульнагарадскіх, гэтак і цэхавых, адзначалася ўсёй цэхавай "брацiяй". Гэтыя святкаванні і мелі назву "братчыны". У святкаванні маглі ўдзельнічаць "братчыкі", запрошаныя асобы і асобы, "вкупившиеся" на час свята. У кола госцеў уваходзілі як іншаслоўныя, гэтак і іншаверцы – праваслаўнае і каталіцкае духавенства, шляхта. Удзельнікі святаў не павінны былі напівацца, разліваць мёд, сварыцца, лаяцца, уваходзіць у дом са зброяй, спрачацца з-за месца, стараста (цэхмістр) мусіў даваць месцы "па стану". Усе спрэчкі і сваркі, узнікшыя падчас свята, вырашаліся "браццямі" і старастай і не падлягалі аніякаму іншаму суду – ні духоўнаму, ні свецкаму.

Рэдактар Генадзь СУДНІК

Тыднёвік Магілёўскі 6

Аналітычна-інфармацыйная газэта, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газэта выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове.

Кошт аднаго асобніка газэты ў гандлі праз сістэму Саюздруку — 3.000 рублёў. У свабодным продажы і ў грамадскіх распаўсюджвальнікаў — па дамоўленасці.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212030, г. Магілёў,
вул. Першамайская, 6-22.

ТЭЛЕФОНЫ:
31-04-15,
22-97-82

Газэта надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.Свярдлова. Замова 6. Наклад 1.100 асобнікаў.